Радыё Свабода

Суды, арышты, зьбіцьцё. Дзень 13. Жывы блог

24 сакавік 2017, 08:08

У Беларусі два тыдні ідуць масавыя суды над удзельнікамі «Маршаў недармаедаў», ужо затрыманыя ці асуджаныя да арышту ці штрафу больш за 300 «недармаедаў», больш за 120 чалавек сустрэнуць Дзень волі ў турмах. За апошнія дні 26 чалавек былі арыштаваныя па справе «Белага легіёну» і «Маладога фронту» пасьля заявы Лукашэнкі пра «лягеры баевікоў». Іх абвінавачваюць у крымінальным злачынстве — падрыхтоўцы да масавых беспарадкаў з выкарыстаньнем зброі.

Суды, затрыманьні, зьбіцьцё. Дзень 12

Яны сустрэнуць Дзень Волі ў турме. Поўны сьпіс затрыманых і арыштаваных. Абнаўляецца

Вынікі дня: Колькасьць затрыманых дасягнула 300 (Відэатрансьляцыя)

Самае новае напача...

00:14 25.3.2017

Сяргей Марцалеў, былы кіраўнік выбарчага штабу Міколы Статкевіча, напісаў на сваёй старонцы ў фэйсбуку: «Па мяне прыйшлі. Дзьверы пакуль не адчыняў».

23:44 24.3.2017

Лідэр БХД **Віталь Рымашэўскі**, які адбывае арышт у Маладэчне, зьвярнуўся са зваротам з нагоды Дня Волі, у якім заклікаў не дазволіць уладам паўтарыць сцэнар 2010 году.

«Людзей зьбіваюць і арыштоўваюць за мірны пратэст. За кожны дзень, забраны з жыцьця, за ўсё, што з намі адбываецца за кратамі, нясе пэрсанальную адказнасьць Аляксандр Лукашэнка, піша Рымашэўскі. — Зараз задача спэцслужбаў Лукашэнкі — ня проста падавіць, але і дыскрымінаваць пратэстны рух. Яны кідаюць за краты дэмакратычных актывістаў па ўсёй краіне, каб вызваліць дарогу для правакатараў. Таму сёньня, калі ёсьць п'яныя сярод удзельнікаў мітынгу — гэта супрацоўнікі спэцслужбаў. Калі ёсьць пагромшчыкі — гэта толькі супрацоўнікі спэцслужбаў Лукашэнкі! Сёньня вулічныя акцыі з гвалтоўнымі дзеяньнямі — падарунак для карнікаў і правакатараў. Гвалт — мэтад баязьліўцаў. Пакінем яго ўладам».

23:27 24.3.2017

Лябедзька, Губарэвіч і Рымашэўскі, відавочна, атрымаюць новыя суткі арышту

Лідары правацэнтрысцкай кааліцыі могуць застацца пад арыштам. А**натоль Лябедзька**, **Юрась Губарэвіч** і **Віталь Рымашэўскі**, якія былі арыштаваныя за ўдзел у Маршы недармаедаў у Маладэчне, рызыкуюць атрымаць новыя тэрміны, не выходзячы на свабоду, паведамляе Радыё Рацыя.

Стала вядома, што сустаршыні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі Віталю Рымашэскаму ўручылі чарговыя пратаколы непасрэдна ў камеры, – кажа адказны сакратар БХД **Дзяніс Садоўскі**. – Прыйшла інфармацыя ад адваката, які наведвае Віталя Рымашэўскага, што яму ў камеры апошнімі днямі былі ўручаны яшчэ два пратаколы за мітынгі ў рэгіёнах, якія Віталь і іншыя лідары правацэнтрысцкай кааліцыі наведалі, таму абсалютна верагодна, што, як планавалася – выхад пасля 15 сутак з Маладэчна 25-га ў 8.00 – магчыма не адбудзецца. Магчыма прама адтуль завязуць у суд і прызначаць новыя суткі.

22:57 24.3.2017

Затрыманага 24 сакавіка на акцыі збору дапамогі арыштаваным удзельнікам «Маршу недармаедаў» у Менску (15 сакавіка) эколяга **Ўладзімера Валодзіна** будуць судзіць за дробнае хуліганства, паведамляе БелаПАН.

Было затрымана і дастаўлена ва УУС Маскоўскага раёну 13 чалавек, у тым ліку карэспандэнты «Радыё Свабода», тэлеканалаў «Белсат» і France 24, а таксама ўкраінскага штотыднёвіка «Новы час». Збор дапамогі ажыццяўляўся 24 сакавіка ў офісе Беларускай партыі «Зялёныя» на вуліцы Фабрыцыўса. Каля 17.40 у офіс «зялёных» прыйшлі чатыры міліцыянта ў форме і паведамілі прысутным, што нібыта зьдзейсьнена злачынства і ўсіх хочуць праверыць на дачыненьне да яго. Пасьля журналістаў адпусьцілі, астатнія знаходзіліся ў РУУС у статусе адміністрацыйна затрыманых. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, іх, як і Валодзіна, таксама будуць судзіць.

22:44 24.3.2017

Двое пінчукоў трапілі на суткі за «Марш недармаедаў»

24 сакавіка праваабаронцы даведаліся, што напярэдадні ў Пінску былі пакараныя арыштамі удзельнікі пінскага «Марша недармаедаў» **Ігар Шэршун** (15 сутак) і **Людміла Надзеявец** (5 сутак). Пра гэта паведаміў праваабарончы сайт «Берасьцейская вясна» «Марш недармаедаў» у Пінску адбыўся 11 сакавіка.

22:05 24.3.2017

Юрыст Свабоднага прафсаюзу Беларускага **Мікалай Шарах** паведаміў на свай старонцы ў фэйсбуку, што ў офісе арганізацыі ў Полацку праходзіць пратрус.

Пазьней ён таксама паведаміў, што прафсаюзнага актывіста Віктара Стукава даставілі ў міліцыю і вінавацяць у брыдкаслоўі.

22:03 24.3.2017

Увечары 24 сакавіка ў Слуцку людзі ў цывільным затрымалі каардынатара Руху “За свабоду” па Менскай вобласьці **Віталя Амяльковіча**, паведамляе праваабарончы цэнтар "Вясна", спасылаючыся на інтэрнэт-газету “Салідарнасьць”, якой паведаміла відавочца затрыманьня:

- Мы выпадкова сустрэліся ў краме «Белмаркет». Віталь мне сказаў, што за ім сочаць. Я адказала: у цябе параноя! А праз некалькі хвілінаў яго ўзялі на выхадзе з крамы. Да яго падышлі двое мужчын у цывільным, паказалі пасьведчаньні, сказалі, што затрымліваюць па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злачынства. Узялі пад рукі і павезьлі на нейкім чорным аўтамабілі. Паводле яе словаў, Віталь Амяльковіч 25 сакавіка зьбіраўся ехаць у Менск на Дзень Волі. Дома ў Віталя Амяльковіча праводзяць вобшук

21:58 24.3.2017

Супрацоўнікі міліцыі 24 сакавіка затрымалі магілёўскага грамадзкага актывіста **Аляксандра Страха**, паведамляе БелаПАН. Пра тое, што ў кватэру Страха ў абласным цэнтры ўварваліся міліцыянты, у сацыяльнай сетцы "Фэйсбук" у 19.20 паведаміў іншы грамадзкі актывіст Аляксандр Шаўцоў. Паводле яго, спачатку хтосьці настойліва званіў у дзьвярны званок, затым на хатні тэлефон, а потым у кватэры Страха была адключаная электрычнасьць.

Страх актыўна выступаў на "Маршы недармаедаў, які прайшоў 15 сакавіка ў Магілёве з удзелам ад 300 да 500 чалавек. Менавіта ён адкрыў мітынг, пачаўшы чытаць свае вершы.

21:55 24.3.2017

Кіраўнік бабруйскага клюбу «Патрыёт» **Мікалай Міхалькоў** зноў затрыманы. Пра гэта стала вядома «Нашай Ніве». Міхалькоў — кіраўнік вайскова-спартовага клюбу «Патрыёт» на базе Цэнтру творчасьці дзяцей і моладзі ў Бабруйску. У мінулым ён кадравы афіцэр, які служыў у адной з паветрана-дэсантных брыгад спэцыяльнага прызначэньня. Яго сын, вайсковец Ян Міхалькоў, быў затрыманы 21 сакавіка па справе аб «падрыхтоўцы масавых беспарадкаў». КДБ заявіў, што ўсяго па справе затрымана 26 чалавек. Міхалькова 23 сакавіка выклікалі ў КДБ у Бабруйску, а сёньня раніцай адпусцілі. Цяпер ён зноў затрыманы.

21:41 24.3.2017

Дэпутатка Палаты Прадстаўнікоў **Алена Анісім** накіравала ліст Генэральнаму пракурору Аляксандру Канюку адносна Алеся Лагвінца, якога падчас затрыманьня моцна зьбівалі, у выніку чаго былі нанесеныя шматлікія пашкоджаньні, што запатрабавала неабходнасьць выкліку хуткай дапамогі непасрэдна ў будынак суду.
У сувязі з фактам неапраўданага прымяненьня фізычнай сілы, бо затрыманы не аказваў супраціўленьня, Алена Анісім просіць неадкладна пачаць пракурорскую праверку ў адносінах да дзеяньняў асобаў, якія праводзілі затрыманьне Алеся Лагвінца. На думку дэпутаткі, такія дзеяньні падлягаюць прыцягненьню ня проста да адміністрацыйнай, але крымінальнай адказнасьці.

21:28 24.3.2017

Паведамляецца, што Ніну Багінскую адпусьцілі. Яна цяпер дома, пра гэта пішуць ў Фэйсбуку яе знаёмыя.

Сёньня 70-гадовая актывістка Ніна Багінская выйшла да менскага будынку КДБ з плякатам «Свабоду палітвязьням» і пералікам часткі затрыманых у сакавіку. Каля 14.55 яе забралі ў сіні мікрааўтобус з нумарамі 9428 ІК-7, зьвезьлі ў, як сказалі міліцыянты, у Цэнтральны РУУС.

20:50 24.3.2017

Позва ў суд для Янукевіча

Старшыня Партыі БНФ **Аляксей Янукевіч** паведаміў, што атрымаў позву ў суд Заводзкага раёну Менску па аратыкуле за «паўторнае цягам году парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў».

«Ня ведаю, ці прысудзілі нешта завочна ці адклалі разгляд, — напісаў Аляксей Янукевіч, — але шанцы на тое, што заўтра сьвята адбудзецца безь мяне, крыху павялічваюцца».

20:33 24.3.2017

Магілёў. У кватэру магілёўскага сябра партыі БНФ, пэнсіянэра **Аляксандра Страха** ўварвалася міліцыя. На тэлефанаваньні актывіст не адказвае.

20:10 24.3.2017

Баранавічы. Затрыманы грамадзка-палітычны актывіст **Аляксандар Швед.**

Пра гэта паведаміў праваабаронца Сяргей Гоўша ў сваім фэйсбуку:
«Мне паведаміла знаёмая, што а 19-00 24 сакавіка зь яе машыны быў выцягнуты людзьмі ў цывільнай вопратцы баранавіцкі актывіст, інвалід 2-й групы Аляксандр Швед. Яго пасадзілі ў машыну „Лада“ з нумарамі 06-75 ІЕ і хутка зьехалі».

18:24 24.3.2017

Бабруйск. Галіна Сьмірнова атрымала штраф 920 рублёў за перапост у «Аднаклясьніках» інфармацыі пра сацыяльны пратэст, заплянаваны на 26 сакавіка.

18:11 24.3.2017

Міліцыя затрымлівае людзей, якія зьбіраюць дапамогу затрыманым, і журналістаў (Відэатрансьляцыя)

17:39 24.3.2017

Затрыманьне на плошчы Якуба Коласа ў Менску

Міліцэйскі патруль спыніў, каб праверыць дакумэнты, **Алену Дзяткоўскую**, сястру Яўгена Дзяткоўскага, асуджанага на 15 сутак за ўдзел у «Маршы недармаедаў» 15 сакавіка ў Менску. Разам з Аленай Дзяткоўскай была яе спадарожніца (прозьвішча ўдакладняецца). Абедзьвюх дзяўчат затрымалі.

17:18 24.3.2017

Актывіста «Моладзі БНФ» Адама Маркевіча затрымалі ў Лідзе і адвезьлі ў міліцэйскі пастарунак. Ён трансьляваў затрыманьне на сваёй старонцы ў фэйсбуку.

17:00 24.3.2017

Бабруйск. **Уладзімер Лазараў** прыйшоў у ГУУС па позьве, там яго затрымалі і адвезьлі ў ізалятар. Далі 12 сутак за ўдзел у акцыі "недармаедаў" у Бабруйску 12 сакавіка.

16:59 24.3.2017

Гомельская гарадзкая пракуратура вынесла афіцыйнае **папярэджаньне** журналістам-фрылянсэрам **Марыі Булавінскай** і яе мужу **Сяргею Ляпіну** за супрацоўніцтва зь «Белсатам». Такое ж папярэджанне вынесена і журналістыцы-фрылянсэру **Марыне Драбышэўскай**.